# …ывай, зімовая сесія! Дзень добры, адпачынак! —

## гавораць студэнты стацыянара

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ
і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 3 (473) | Серада, 24 студзеня 1962 г. | Цана 1 кап.

БОЛЬШ МЕСЯЦА ПРАЦЯГВАЛАСЯ ЗІМОВАЯ СЕСІЯ. ПАЧАЛАСЯ ЯНА ЯШЧЭ ДА НОВАГА ГОДА. ПЕРШЫЯ ЗАЛІКІ, КАНСУЛЬТАЦЫІ... А ВОСЬ І ЭКЗАМЕНЫ! З ПАЧУЦЦЕМ ВЯЛІКАЙ АДКАЗНАСЦІ ІШЛІ СТУДЭНТЫ РОЗНЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ НА ІСПЫТЫ. І ЗДАЛІ ІХ ЯК МАЕ БЫЦЬ. У ЗАЛІКОЎКАХ СОЦЕНЬ ЮНАКОЎ І ДЗЯЎЧАТ З'ЯВІЛІСЯ НОВЫЯ ДОБРЫЯ І ВЫДАТНЫЯ АДЗНАКІ.

А ЦЯПЕР, КАЛІ БОЛЬШАСЦЬ НАШЫХ ТАВАРЫШАЎ ПАСПЯХОВА ЗДАЛА ЎСЕ ПРАДМЕТЫ СЕСІІ, МОЖНА З ПАЛЁГКАЙ І РАДАСЦЮ ЎЗДЫХНУЦЬ І СКАЗАЦЬ:

**— ДЗЕНЬ ДОБРЫ, СТУДЭНЦКІЯ КАНІКУЛЫ!**

*Ідуць апошнія экзамены*

# Хвалюецца кожны студэнт...

*КАЛІДОРЫ універсітэта напоўнены гаманлівай студэнцкай моладдзю. Невялікія групкі студэнтаў вядуць гарачыя спрэчкі, хвалююцца. І хоць кажуць, што перад смерцю не надыхаешся, аднак большасць студэнтаў не растаецца з падручнікамі. Кожны стараецца яшчэ і яшчэ раз прабегчы вачыма тыя раздзелы, якія не паспеў паўтарыць у апошні дзень перад экзаменам.*

*На дзвярах большасці аўдыторый вісяць лаканічныя надпісы: «Экзамен!», альбо «Ціішэй! Ідзе экзамен!»*

*І будзь гэта першы экзамен у студэнцкім жыцці або апошні, напэўна, не знойдзецца чалавека, які б не хваляваўся перад ім.*

*Вось і сёння студэнты першай групы II курса геаграфічнага факультэта, што прыйшлі здаваць экзамен па геаграфіі раслін, хвалююцца, як некалі на першым курсе. Шасцяць старонкі падручнікаў, тэрмінова перагортваюцца канспекты, яшчэ раз праглядаюцца пытанні. Найбольш нервовыя ўвогуле нічога не праглядаюць, а толькі крочаць па калідоры, трымаючы пад пахай цэлую кіпу падручнікаў і канспектаў.*



У залікоўцы стаіць «добра». Валянціна Тальвінская задаволена.



Як там трымаюцца нашы?

*Кожнаму, вядома, цікава даведацца, як трымаюцца яго аднакурснікі, ці ведаюць яны матэрыял. Таму зразумела хваляванне і Анатоля Тарана. Яму захацелася зазірнуць у вакно дзвярэй і даведацца, ці ўсё ў парадку? І калі на парозе з'ўляецца задаволеная Валянціна Тальвінская, усе з палёгкаю ўздыхаюць.*

*— Ну што? Як там? — сыплюцца пытанні.*

*— «Добра», — усміхаецца Валянціна.*

*Яе акружаюць сяброўкі, паціскаюць ёй рукі, а адна нават узнагароджвае яе пацалункам.*

*У такіх выпадках прыходзіцца шчасліўцу добрай адзнакі вытрымліваць другі экзамен — перад сябрамі. Сыплюцца пытанні адно за другім. Большасць з іх, вядома, такога зместу: што папалася ў білеце, як пытае выкладчык, ці шмат задае пытанняў, ці не блытае знарок студэнта.*

*Але вось дзверы адчыняюцца і выходзіць Нона Рудакова. Па выразу яе твару можна зразумець, што ў яе заліковай кніжцы таксама з'явілася добрая адзнака.*

*Нам захацелася прайсці ў аўдыторыю і паслухаць адказы студэнтаў. Каля карты Галіна Міхайлоўская. Адказ студэнткі ясны і поўны. Яна падмацоўвае яго дэталёвым расказам аб водарасцях вадаёмаў і рэк Беларусі. Але на другое пытанне — якія злакавыя растуць у стэпах — Галіна адказвае не пэўна. Выкладчыку Наталлі Отаўне Цэтэрман прыходзіцца даваць наводзячыя пытанні. І ўсё роўна студэнтка што называецца «плавае».*

*— Што ж, прыдзецца вам паставіць толькі «здавальняюча», — гаворыць выкладчык.*

*І хоць адзнака здавальняючая, але студэнтку яна не зусім задавальняе. Гэта яўна адбіваецца на яе твары.*

*З задавальненнем мы слухалі адказ Эдуарда Войціка. Яму прыйшлося адказваць на такія пытанні: «1. Еўра-сібірская і япона-кітайская падвобласці. 2. Хімічныя і фізічныя ўласцівасці глебы. 3. Хвойныя, іх галоўныя прадстаўнікі». Яго адказ выявіў добрае веданне расліннага свету, умелую арыентыроўку па карце. І калі Наталля Отаўна паставіла ў залікоўку Эдуарда «добра», мы пашкадавалі аб гэтым. Мы чакалі, што яго адказ будзе ацэнены толькі выдатнай адзнакай.*



Адказвае Эдуард Войцік.

*Хочацца сказаць аб выніках экзамена. З усёй групы «выдатна» атрымалі толькі двое — Аляксандр Пракаповіч і Алена Жучкевіч. «Добра» атрымалі 8. Сярод іх Эдуард Войцік, Валянціна Зіневіч, Нона Рудакова, Барыс Салагуб, Валянціна Тальвінская і другія. Астатнім выкладчыца паставіла «здавальняюча».*

*Нам чамусьці здаецца, што за строгасцю і патрабавальнасцю выкладчыка хаваецца недаацэнка ведаў студэнтаў. Возьмем, напрыклад адказ Мілы Бязручка. Ей дастаўся білет № 2. У ім стаялі пытанні: «Агульныя заканамернасці размеркавання расліннасці зямнога шара. Лясы і кустарнікі лаўровага тыпу. Будова расліннай клеткі». Студэнтка нядрэнна ведала карту, добра арыентавалася ў матэрыяле і ўсё ж атрымала... «здавальняюча».*

*Нам здаецца, што больш мэтазгодна было б прыцягваць да ўдзелу ў экзамене тых выкладчыкаў, якія вялі семінарскія і практычныя заняткі па данаму прадмету. Яны добра ведаюць студэнтаў, сачылі за іх падрыхтоўкай і працай на працягу ўсяго семестра. Гэта быў бы больш аб'ектыўны падыход да справы. Мы упэўнены, што ў групе было б больш выдатных і добрых адзнак.*

Тэкст і фота Л. КУДРОВА.



Нона Рудакова таксама атрымала «добра».

**17—18 СТУДЗЕНЯ Ў МІНСКУ АДБЫЎСЯ XXII З'ЕЗД ЛКСМ БЕЛАРУСІ.**

**З'ЕЗД З'ЯВІЎСЯ ЯРКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫЯЙ ВЕРНАСЦІ І АДДАНАСЦІ НАШАЙ МОЛАДЗІ ВЯЛІКАЙ СПРАВЕ КАМУНІЗМА.**

**З'ЕЗД ЗАКЛІКАЎ УСІХ ЮНАКОЎ І ДЗЯЎЧАТ РЭСПУБЛІКІ ПРЫКЛАСЦІ ЎСЕ СВАЕ СІЛЫ, ЭНЕРГІЮ І ВЕДЫ НА ХУТЧЭЙШАЕ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ПРАГРАМЫ КПСС — ПРАГРАМЫ СВЕТЛАЙ БУДУЧЫНІ ЧАЛАВЕЦТВА.**

# Універсітэцкая хроніка

## Перавыбары дэканаў

По загаду рэктара да 16 студзеня 1962 года павінны былі прайсці перавыбары дэканаў на ўсіх факультэтах.

Вось дэканы, абраныя на новы тэрмін:

**ПЁТР ЗАХАРАВІЧ САВАЧКІН** (гістфак),
**МІХАСЬ РЫГОРАВІЧ ЛАРЧАНКА** (філфак),
**ВАСІЛЬ АЛЯКСАНДРАВІЧ ДАРОГІН** (юрфак),
**ІВАН РЫГОРАВІЧ ЦІШЧАНКА** (хімфак),
**ЛЕАНІД ВІКЕНЦЬЕВІЧ ВАЛАДЗЬКО** (фізфак),
**ПАВЕЛ РЫГОРАВІЧ ПЯТРОВІЧ** (біяфак),
**ІВАН ІВАНАВІЧ ТРУХАН** (геафак),
**ФЁДАР ДЗМІТРЫЕВІЧ ГАХАЎ** (матфак).

## Цікавы даклад

17 студзеня каля пяці гадзін вечара ў аўдыторыю № 43 хімкорпуса пачалі збірацца выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта. Былі тут прадстаўнікі і ад другіх факультэтаў.

У гэты дзень перад прысутнымі прафесар І. З. Фішэр прачытаў даклад на тэму: «Адмоўныя тэмпературы». Слухачы засталіся задаволенымі цікавым навуковым дакладам, арганізаваным кафедрай ядзернай фізікі.

## На падрыхтоўчых курсах

Шмат ёсць жадаючых паступіць ва універсітэт. Гэта юнакі і дзяўчаты, якія працуюць на розных прадпрыемствах і ва ўстановах, калгаснікі і рабочыя саўгасаў Мінскага раёна.

У гэтым годзе падрыхтоўчыя курсы пачалі дзейнічаць 8 студзеня 1962 года. На курсах займаюцца 500 чалавек. У групах, дзе займаюцца юнакі па таму ці іншаму профілю, заняткі вядуць выкладчыкі розных кафедраў універсітэта.

## Насустрач выбарам

30 снежня 1961 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанавіў правесці выбары ў Вярхоўны Савет СССР шостага склікання ў нядзелю, 18 сакавіка 1962 года.

Ва універсітэце дзейсна рыхтуюцца сустрэць гэты святочны дзень — радасны дзень для кожнага савецкага чалавека.

У корпусе гуманітарных навук запаліліся агні першага агітпункта. Там сабрана патрэбная літаратура аб правах і абавязках савецкіх грамадзян, аб тым, якія гарантыі дае грамадзянам СССР Савецкая Канстытуцыя, сабраны падшыўкі часопісаў і газет. На агітпункце ўстаноўлены дзяжурствы, а хутка будуць вывешаны спіскі выбаршчыкаў. Шмат агітатараў універсітэта пачалі праводзіць перадвыбарчую агітацыю.

# ДЗЕЙСНАЯ ДАПАМОГА КАЛГАСНІКАМ

*Нарада работнікаў сельскай гаспадаркі Беларусі. Колькі думак, разважанняў, смелых замыслаў вызвала яна ў людзей, колькі сэрцаў закранула! У рабоце ж нарады ўдзельнічаў Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў.*

*Гаварылі на нарадзе і аб навуцы. Яна павінна быць на пярэднім краі нашага жыцця, дапамагаць уздыму народнай гаспадаркі. Сёння ў сваім артыкуле ст. выкладчык кафедры геалогіі глебазнаўства біяфака, начальнік глебавага атрада* В. І. Пашын *расказвае аб тым, як студэнты і выкладчыкі універсітэта мацуюць сувязі навукі з жыццём.*

**У 1957 годзе пры кафедры геалогіі глебазнаўства біялагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна быў арганізаваны глебавы атрад. Ён налічваў 25 чалавек. Мэта яго— правядзенне абследавання глеб у калгасах і саўгасах БССР.**

**Пачынаючы з 1957 года да канца 1961 года атрад зрабіў наступную работу: складзены глебавыя карты, картаграмы і нарысы для калгасаў і саўгасаў Дзяржынскага, Уздзенскага, Слуцкага, Смалявіцкага і Крупскага раёнаў. З канца мая 1961 года пачалося даследванне глеб 15 калгасаў і 3 саўгасаў Пухавіцкага раёна. Закончыць гэту работу мяркуецца ў красавіку 1962 года.**

**У маі 1962 года глебавы атрад прыступіць да даследвання глеб у Івянецкім і другіх раёнах.**

**Глебавым атрадам праведзена ўжо даследванне і вывучэнне глеб на плошчы каля 365 тысяч гектараў.**

**Інжынеры-глебазнаўцы правод зілі таксама даследванні раслінага покрыва, натуральных угоддзяў (лясоў, балот, лугоў), геалагічных, геамарфалагічных і гідрагеалагічных умоў на тэрыторыі многіх калгасаў і саўгасаў рэспублікі.**

**Даследванні глеб і раслін закончыліся складаннем дэталёвых глебавых дакументаў: па кіслотнасці і патрэбнасці глебы ў вапнаванні, па забеспячэнню глебы неабходнымі для раслін фосфарам і каліем, па рацыянальнаму выкарыстанню зямель. Глебазнаўчы атрад склаў нарыс з падрабязнай характарыстыкай марфолага-генетычных, аграхімічных і агравытворчых асаблівасцей даследвання глебы з рэкамендацыямі па іх паляпшэнню, па павышэнню іх урадлівасці. Глебавыя карты аказваюць вялікую дапамогу калгасам і саўгасам пры праектаванні севазваротаў і трансфармацыі сельгасугоддзяў і для рацыянальнага выкарыстання сваіх зямельных рэсурсаў.**

**Картаграма кіслотнасці глебы дазваляе калгасам і саўгасам правільна падыходзіць да іх вапнавання (у сэнсе чаргавання вапнавання палёў, устанаўлення норм вапнавых унясенняў, вызначэння эфектыўнасці фасфарытнай мукі і суперфасфатаў). Картаграма забяспечанасці глеб даступнымі для раслін фосфарам і каліем дае аснову калгасам і саўгасам закупліваць у неабходнай колькасці фосфарныя, калійныя і іншыя мінеральныя угнаенні і ўносіць іх на палі пад адпаведныя сельскагаспадарчыя культуры, а таксама на лугі і выпасы.**

**Дэталёвыя даследванні глеб сельгасарцелей і саўгасаў паслужаць матэрыялам для складання глебавых карт, картаграм і нарысаў у цэлым па таму ці іншаму адміністрацыйнаму раёну, а затым і па вобласці і, у канчатковым выніку, для састаўленян новай, больш дакладнай глебавай карты Беларусі.**

**Глебавыя карты неабходны для раённых, абласных і рэспубліканскіх плануючых арганізацый і ўстаноў.**

**Цяпер я заканчваю складанне глебавай карты і нарыса па Дзяржынскаму раёну, супрацоўнік атрада А. М. Папова — па Смалявіцкаму раёну.**

**Няма ніякай патрэбы даказваць, як важны такія даследванні, і якое значэнне яны набываюць цяпер, у час, калі наша рэспубліка бярэ новы разгон ва ўздыме сельскай гаспадаркі. Наша работа знаходзіць шырокае прызнанне ва ўсіх гаспадарках рэспублікі.**

**В. ПАШЫН.**

# Юбілей вучонага

20 студзеня 1962 года споўнілася 60 год Неафіту Ермалаевічу Рагозіну, доктару эканамічных навук, аднаму са старэйшых выкладчыкаў універсітэта.

Многія пакаленні студэнтаў успамінаюць шчырым словам свайго настаўніка, выдатнага географа, чулага чалавека. Ва універсітэце Неафіт Ермалаевіч працуе з 1947 года, якраз з таго часу, калі універсітэт толькі што пачаў уздымацца з руін і набіраць сілы.

За гэтыя гады Неафіт Ермалаевіч многа і плённа папрацаваў не толькі як выкладчык, але і як вучоны.

Не так даўно ў кніжных магазінах Мінска можна было ўбачыць кніжку ў яркай вокладцы, якая называецца «Гарады і сёлы Беларусі». Гэту кнігу разам з вучонымі універсітэта А. Я. Малышавым і Д. А. Жучкевічам напісаў і Неафіт Ермалаевіч Рагозін.

У 1961 годзе Неафіту Ермалаевічу было прысвоена званне доктара эканамічных навук за дысертацыю «Развіццё прамысловасці Заходняй Сібіры».

Н. Е. Рагозін ведае добра не толькі Заходнюю Сібір, але і эканоміку роднай Беларусі, у прыватнасці Палесся. Па гэтых раёнах Н. Е. Рагозін напісаў шэраг артыкулаў, якія друкаваліся ў часопісах і «Навуковых запісках універсітэта». Надрукаваў Неафіт Ермалаевіч і іншыя работы.

У дзень 60-годдзя Н. Е. Рагозін узнагароджаны ганаровай граматай рэктарата. Сябры па рабоце, супрацоўнікі універсітэта пажадалі Неафіту Ермалаевічу доўгіх год жыцця і плённай работы.

*Працягваем абмеркаванне артыкула А. Стрыжэвіча «Плячо калектыва»*

# НАША СІЛА Ў КАЛЕКТЫВІЗМЕ

Ярка свеціць нам наша будучыня—камунізм. Яго праменні ўжо асвятляюць працоўныя будні нашага народа, яго поспехі ў будаўніцтве камуністычнага грамадства. Кожны дзень прыносіць нам новыя перамогі.

На фоне бліскучых дасягненняў нашага народа асабліва ярка бачны нашы недахопы. Не таму, што іх стала больш, а таму што кожны калектыў, кожны чалавек гэтага калектыву павінен стаць непасрэдна будаўніком камунізма. Лозунг камуністычных брыгад: «Адзін за ўсіх, а ўсе за аднаго!» трывала ўваходзіць у наша жыццё. Студэнцкі калектыў адчувае адказнасць за лёс кожнага свайго члена, студэнта.

Наш калектыў—першы курс аддзялення рускай мовы і літаратуры—вельмі малады. Але за час вучобы, сумеснай працы у калгасе, на будаўніцтве новага корпуса універсітэта, разам адпачываючы, мы здружыліся, зблізіліся. Калектыў адчуў сваю сілу.

У студэнта Юрыя Чукава здарылася няшчасце. Калектыў акружыў яго клопатам, увагай, не даў адстаць, аказаў маральную падтрымку. Але, напэўна, гэтага было недастаткова. Засумаваў хлопец. Закінуў вучобу, перастаў наведваць лекцыі і г. д. Усхваляваныя гэтым, яго таварышы не раз гутарылі з ім, спрабавалі вярнуць яго да кіпучага студэнцкага жыцця. Але толькі пасля размовы на камсамольскім сходзе Юрый знайшоў у сабе сілы вярнуцца да вучобы, да работы, стаў рэгулярна наведваць лекцыі і сам папрасіў даць яму якое-небудзь грамадскае даручэнне.

Вось яно, плячо калектыву! Вось яна, сапраўдная дапамога сяброў!

## Які ён, чалавек будучага, чалавек камунізма?

Добра, калі кожны студэнт прымае актыўны ўдзел у жыцці свайго аддзялення, курса, факультэта. Але, на жаль, у нас ёсць яшчэ нямала абыякавых. Знаходзячыся ў калектыве, яны адказваюцца выконваць грамадскія і камсамольскія даручэнні. У гэтым віна самога калектыву і, перш за ўсё, камсамольскага арганізатара. Так, сакратар камсамольскай арганізацыі нашага аддзялення М. Слабодчыкаў, які ўсю работу ўзваліў на сябе, забыў аб існаванні членаў бюро, цягне яе, сагінаючыся ад цяжкасці. Калі б камсорг больш прынцыпова размеркаваў абавязкі сярод камсамольцаў, не было б студэнтаў, якія засталіся ў баку ад грамадскага жыцця. Студэнтка Ляшок не сумавала б на камсамольскіх сходах, не чытала б мастацкай літаратуры, студэнтка Лабодская не крыўдзілася б на тое, што ў яе няма ніякай камсамольскай нагрузкі, стараста групы Груша не кінула б папрок камсоргу: «Колькі табе за работу плоцяць?» Больш было б часу для вучобы ў сапраўдных актыўных камсамольцаў Цапковай, Савасцьян, Агамірзавай, Нечаева, Семянковай і іншых.

Удзел кожнага члена калектыву ў грамадскім жыцці набліжае нас да ідэала-чалавека камуністычнага будучага. А камуністычнае грамадства— гэта высокаарганізаваная садружнасць людзей, свядомых, перадавых, высокаадукаваных.

**Б. Бондараў,**
студэнт 1-га курса рускага аддзялення.

## ЗІМОЙ

*Раніца. Шэрань. Ветрык.*
*Стук у шыбу сініцы.*
*Выбег на вуліцу Петрык—*
*Дома яму не сядзіцца.*
*Сажалка кліча. Абшары*
*У казачным стынуць уборы.*
*Петрык стаіць, і на твары*
*Радасці плешчацца мора.*
*Ён не баіцца мароза:*
*Ён той мастак, не болей...*
*Холадна толькі бярозам*
*У чыстым адкрытым полі.*

**М. КУЛІНКОВІЧ.**

# *У паходы па Беларусі!*



Наш карэспандэнт узяў інтэрв'ю ў старшыні прафкома універсітэта Аляксандра Цалко адносна зімовага адпачынку студэнтаў.

— Дзе будуць адпачываць студэнты зімой? Хто паклапоціцца аб іх цікавым, здаровым адпачынку?

**А. Цалко.** Многія ў час зімовых канікул паедуць у санаторыі і дамы адпачынку. У час студэнцкіх канікул многа прыдзецца папрацаваць культмасаваму сектару.

— Ці паўторацца ў гэтым годзе традыцыйныя лыжныя паходы?

**А. Цалко.**—Так. Нашы лыжнікі, члены секцыі турызма-альпінізма, намераваюцца прайсці паходамі па розных кутках роднай Беларусі. Гэта будзе іх лепшым адпачынкам.

Мы ўжо расказвалі аб паходах універсітэцкіх турыстаў па Каўказу, Цянь-Шаню, Прыкаспію. Тады было лета.

— Тады,—жартуюць турысты,— мы ў спёку шукалі снег.

Цяпер снегу колькі заўгодна. Каля 160 чалавек пажадалі ўжо пракласці лыжню па снегавой цаліне. Нашы падарожнікі будуць у сёлах і мястэчках праводзіць вялікую культурна-масавую работу: расказваць аб XXII з'ездзе КПСС, аб нарадзе работнікаў сельскай гаспадаркі Беларусі, на якой прысутнічаў М. С. Хрушчоў. Не забудуць яны расказаць аб слаўным 40-годдзі БДУ імя Леніна, аб студэнцкім жыцці. Такіх камсамольскіх ініцыятыўных груп будзе каля 20.

**На здымку** вы бачыце турыстаў універсітэта на адной з Цянь-Шанскіх вяршынь (лета 1961 года).

# ЯК АЛЕСЬ ЗАЛІКОЎКІН ЗДАВАЎ ЭКЗАМЕН ПА ПЛАВАННЮ

Малюнак М. ЗНАКА.



— *Я ж плаваць не ўмею!* — *Уперад! Не бойся!* — *Напэўна, затану!* — *Буль-буль-буль...* Выкладчык:—*Усё ў парадку, можна паставіць добрую адзнаку.*

*НАШ АДРАС: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31, тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва МВСС і ПА БССР. Зак. 179. АТ 08934.* **Нам. рэдактара А. ВОЛК.**